# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

23 СТУДЗЕНЯ
1997 года
чацвер
№1
(1756)


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


Пра ўмовы конкурсу навукова-даследчых праектаў паведамляе Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў

Стар. 2

Магчыма, "Шпаргалка для завочніка" дапаможа Вам у цяжкую хвіліну. Але не трэба ўспрымаць яе занадта сур'ёзна

Стар. 3

"Майстроўня" — старонка мастацкіх твораў нашых студэнтаў

Стар. 4


З нагоды

## "Я ўспрыняў гэта без асаблівых хваляванняў"

*Пачатак 1997 года вызначыўся выдатнай падзеяй: прафесару факультэта журналістыкі Барысу Васільевічу Стральцову было нададзена ганаровае званне Заслужанага дзеяча культуры.*

**— Барыс Васільевіч, Вы ведалі, што Вам "пагражае" гэтае званне?**

— Я ведаў, што Саюз журналістаў год таму падаваў такую "заяўку". Яна блукала там недзе па розных інстанцыях. Нядаўна гляджу тэлебачанне, раптам чую — прысудзілі...

**— Што Вам давялося зрабіць для атрымання звання Заслужанага дзеяча?**

— Я думаю, папрацаваць паўстагоддзя. Спачатку ў "Звяздзе", а потым — на факультэце журналістыкі.

**— Як адрэагавалі на гэтую навіну Вашы сябры?**

— Нармальна, віншавалі. У мяне не так даўно памяняўся тэлефон, таму залішніх праблем з гэтым не было.

**— Ці дае гэтае званне Вам якія-небудзь ільготы?**

— Наўрад ці. Я і пасведчанне (так гэта называецца?) яшчэ не атрымаў — не ведаю, трэба ў юрыста папытацца. Хіба што да пенсіі якую злыбяду дабавяць. А так, увогуле, не ўяўляю, куды яго можна "прычапіць" з карысцю.

**— Ці паўплывала гэтая падзея на Вас?**

— Гэта моладзь хвалюецца, думае пра ўзнагароды, адзнакі. А я ўспрыняў гэта без асаблівых хваляванняў. Як і раней, выкладаю "Асновы літаратурна-мастацкай творчасці" на нашым факультэце і вяду спецкурс у педагагічным універсітэце.

Наш факультэт робіць вялікія намаганні, каб выпускаць эрудыраваных людзей. І пакуль у яго гэта атрымоўвалася. У былым Саюзе ён лічыўся адным з лепшых. Хачу пажадаць, каб ён і далей трымаў марку, не губляў свайго аўтарытэту.

*Гутарку вяла Валерыя АЎСЯНІК*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ТЭЛЕТАЙП

Учора Сёння Заўтра

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

Сваю 242-ю гадавіну адзначыць 25 студзеня, у Таццянін дзень, Маскоўскі дзяржаўны універсітэт. Гэтай жа падзеі будзе прысвечана чарговае пашыранае пасяджэнне выканкама Еўразійскай студэнцкай асацыяцыі (яе штаб-кватэра знаходзіцца ў МДУ), з якой у Белдзяржуніверсітэта моцныя сяброўскія адносіны. З гэтай нагоды ў Маскву запрошаныя начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю БДУ, віцэ-прэзідэнт Еўразійскай студэнцкай асацыяцыі А.Б.Багдановіч і каардынатар студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ А.А.Лабкоў.

Больш падрабязную інфармацыю пра сустрэчу чытайце у наступных нумарах нашай газеты.

*Аляксандр ЛАГІМАХАЎ, метадыст аддзела выхаваўчай работы з моладдзю БДУ*

*Рэдакцыя газеты "Беларускі універсітэт" шчыра віншуе з юбілеем доктара філасофскіх навук, прафесара Анатоля Ізотавіча ЗЕЛЯНКОВА. Жадаем моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця і поспехаў у працы.*

• • •

16 студзеня ў актавай зале філалагічнага факультэта адбыўся спектакль-канцэрт "Люблю тебя сейчас..." паводле кнігі Марыны Уладзі "Уладзімір, ці Перарваны палёт" і твораў Уладзіміра Высоцкага. Артыстка тэатра і кіно Любоў Чыркова і артыст маскоўскага тэатра на Таганцы Валерый Чарняеў стварылі ў зале атмасферу душэўнай цеплыні і ўзвышаных пачуццяў...

• • •

27 снежня ў галоўным корпусе нашага універсітэта адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя Мінскага гарадскога камітэта Беларускага саюза моладзі. Першым сакратаром камітэта быў абраны Г.У.Рашэцька. У сваім выступе ён адзначыў, што вядучая ВНУ нашай дзяржавы — Белдзяржуніверсітэт — з нядаўняга часу атрымаў новы імпульс для развіцця ініцыятываў студэнцкай моладзі. У нашым універсітэце дзякуючы падтрымцы рэктарата, прафкама студэнтаў, аддзела выхаваўчай работы з моладдзю атрымала развіццё такая форма самакіравання, як студэнцкія саветы. Для студэнтаў, якія прымаюць актыўны ўдзел у развіцці студэнцкага самакіравання, арганізавана сістэма даплатаў. Далей Г.У.Рашэцька адзначыў, што выпускнік ВНУ павінен атрымліваць навыкі работы з людзьмі не толькі на лекцыях і семінарскіх занятках, але і праз працу ў маладзёжных арганізацыях.

*Павел СКАЛАБАН, сакратар камітэта БСМ БДУ*

Юбілеі

## "Мая работа вельмі блізкая да дзіцячай мары"

*У канцы мінулага года споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння і 37 гадоў навуковай і педагагічнай дзейнасці дэкана геаграфічнага факультэта, прафесара, загадчыка кафедры геадэзіі і картаграфіі Расціслава Афанасьевіча ЖМОЙДЗЯКА.*

Візітоўка:

**Пасля заканчэння з адзнакай у 1954 годзе Ганцавіцкага педагагічнага вучылішча Р.А.Жмойдзяк паступае на геграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1961 года яго жыццё і дзейнасць звязаныя з універсітэтам, дзе ён прайшоў шлях ад асістэнта да прафесара, дэкана геаграфічнага факультэта.**

**З іменем Р.А.Жмойдзяка цесна звязваюцца развіццё геаграфічнага факультэта і вышэйшай геаграфічнай адукацыі ў рэспубліцы. Пры яго непасрэдным удзеле адкрываюцца новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі, кафедры, навукова-даследчыя лабараторыі, пабудаваная вучэбная геаграфічнага станцыя "Заходняя Бярэзіна". Пяру Р.А.Жмойдзяка належаць шматлікія навукова-метадычныя артыкулы і распрацоўкі. Ён — аўтар шэрагу вучэбных дапаможнікаў па правядзенню лабараторна-практычных заняткаў і палявых практык па тапаграфіі, картаграфіі, эканамічнаму картаграфіраванню і тапографа-картаграфічнаму чарчэнню. Р.А.Жмойдзякам апублікавана каля 300 навуковых працаў.**

**Плённая навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць прафесара Жмойдзяка высока ацэненая. Ён узнагароджаны Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР, нагрудным знакам Мінвуза СССР "За выдатныя поспехі ў працы", Граматай XXIII Міжнароднага Геаграфічнага кангрэса, Ганаровымі граматамі і медалём Геаграфічнага таварыства СССР, у 1992 годзе яму нададзена ганаровае званне "Заслужаны работнік народнай адукацыі".**

З нагоды юбілею карэспандэнт "Беларускага універсітэта" задаў Расціславу Афанасьевічу некалькі пытанняў.

***— Якімі прынцыпамі Вы карыстаецеся ў сваёй навукова-педагагічнай дзейнасці?***

— Перш за ўсё — добрыя адносіны з супрацоўнікамі і студэнтамі. Да кожнага павінен быць індывідуальны падыход, трэба ўлічваць здольнасці і схільнасці кожнага.

***— Калі б Вы не сталі геаграфам, які шлях выбралі б у жыцці?***

— Я вырас у сялянскай сям'і і з дзяцінства палюбіў родную прыроду. Напэўна, стаў бы работнікам лясной гаспадаркі. Як бачыце, мая работа вельмі блізкая да дзіцячай мары. Спецыяльнасць тапографа прыйшлася мне па душы, і я магу з упэўненасцю сказаць, што вельмі люблю сваю работу.

***— Вы выкладаеце на факультэце шэраг дысцыплінаў. На Вашую думку, ці цяжка здаваць экзамены прафесару Жмойдзяку?***

— Экзамен — гэта вынік сумеснай работы выкладчыка і студэнта падчас семестра. Экзамен высвятляе, як яны папрацавалі, якіх дасягнулі вынікаў. А таму многае залежыць і ад выкладчыка: трэба выкладаць прадмет сцісла і даходліва. І, галоўнае, зацікавіць студэнта. Тады не трэба будзе нікога прымушаць, студэнты будуць самастойна займацца па прадмету.

***— Звычайна выкладчыкі любяць расказваць пра анекдатычныя сітуацыі, якія здараюцца ў час здачы экзаменаў. Калі ласка, прыгадайце якую-небудзь.***

— Практыка. Тэадалітныя здымкі мясцовасці. Усе праверкі



зробленыя. Падыходжу да студэнта і бачу, што візірная вось (умоўная лінія) — няспраўная. Студэнт, якому не прыйшло ў галаву паправіць прыбор, тут жа адпраўляецца на станцыю ў лабараторыю па гэтую вось.

***— Як змяніліся студэнты з таго часу, калі Вы самі былі студэнтам? І ці змяніліся ўвогуле?***

— Так, студэнт стаў іншым. Яго трэба зразумець і знайсці асобны падыход. Калі я быў студэнтам ці пачынаў педагагічную дзейнасць, у студэнта былі больш сур'ёзныя адносіны да вучобы, грамадскай работы. Рэдка прапускалі заняткі. Сённяшняя дэмакратызацыя стварыла нам многа праблемаў. Студэнты прапускаюць заняткі, а таму недаатрымліваюць веды. Даводзіцца дапускаць да здачы экзаменаў студэнтаў, якія не здалі залікі. Многія студэнты не атрымліваюць стыпендыі. Хаця, на мой погляд, маглі б гэта рабіць пры менш абыякавым стаўленні да вучобы.

*Наталля САВЕЛЬЕВА*

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

Загадчыка кафедры сучаснай беларускай мовы;

**Прафесараў кафедраў:** тэарэтычнай фізікі, цеплафізікі (0,25 стаўкі), методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, дыпламатычнай і консульскай службы;

**Дацэнтаў кафедраў:** методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, эканамічнай геаграфіі замежных краін, гісторыі беларускай літаратуры, гісторыі журналістыкі і літаратуры, замежнай журналістыкі і літаратуры, расійскай і славянскай гісторыі са старажытных часоў да XX стагоддзя, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, міжнародных эканамічных адносін, тэарэтычнай фізікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, функцыянальнага аналізу, дыферэнцыяльных ураўненняў;

**Старшых выкладчыкаў кафедраў:** фізікі, тэорыі функцый, эканамічных навук, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, лікавых метадаў і праграміравання;

**Выкладчыкаў кафедраў:** агульнага землязнаўства, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання (спецсродкі), фізічнага выхавання і спорту;

**Асістэнтаў кафедраў:** фізікі цвёрдага цела, лікавых метадаў і праграміравання.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 2-26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" 23 студзеня 1997 года.



Мікалай Тарасавіч Раманоўскі

7 студзеня 1997 года на 85-м годзе жыцця памер цудоўны чалавек, паважаны і мудры педагог, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, вядомы беларускі эканоміка-географ, заслужаны работнік вышэйшай школы, доктар эканамічных навук, прафесар Мікалай Тарасавіч Раманоўскі.

Ён нарадзіўся 7 снежня 1912 года ў прыгарадзе Мінска ў сялянскай сям'і. У 1934 годзе М.Т.Раманоўскі паступіў у Беларускі інстытут народнай гаспадаркі, які скончыў выдатна праз чатыры гады і быў рэкамендаваны ў аспірантуру пры Белдзяржуніверсітэце. Абараніць дысертацыю яму перашкодзіла вайна.

За мужнасць і баявыя заслугі ён быў узнагароджаны ў 1943 годзе ордэнам Айчыннай вайны I ступені, а ў 1944 — ордэнам Чырвонай Зоркі.

З верасня 1946 года Мікалай Тарасавіч стаў працаваць у Белдзяржуніверсітэце і не змяняў месца сваёй працы больш за 50 гадоў. У 1947 годзе ён быў абраны дэканам геаграфічнага факультэта і займаў гэтую пасаду амаль 30 гадоў. Пры яго непасрэдным удзеле на факультэце арганізоўваліся новыя кафедры і навукова-даследчыя лабараторыі, быў створаны шэраг спецыялізацый па новых навуковых накірунках, пабудаваная навучальная геаграфічная станцыя "Заходняя Бярэзіна" і г.д.

У 1972 годзе яму было нададзена навуковае званне прафесара па кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін, якую ён заснаваў у 1966 годзе і загадваў ёй больш за 20 год. Пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле М.Т.Раманоўскага быў падрыхтаваны шэраг падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ, па якіх вучыліся шматлікія пакаленні географаў. Усяго ён апублікаваў больш за 100 навуковых прац.

Багатыя навуковыя ідэі Мікалая Тарасавіча развівалі ў сваіх навуковых даследаваннях аспіранты і саіскальнікі, якія распрацоўвалі праблемы развіцця і размяшчэння асобных галін гаспадарчага комплексу Беларусі, комплекснага асваення прыродных і працоўных рэсурсаў, аптымізацыі знешнеэканамічных сувязяў і іншых актуальных навуковых накірункаў сучаснай геаграфіі. Усяго пад кіраўніцтвам М.Т.Раманоўскага было падрыхтавана больш за 10 кандыдатаў навук, якія сталі вядучымі спецыялістамі многіх навуковых цэнтраў і ВНУ Беларусі.

Шматграннай і плённай была грамадская дзейнасць прафесара. За актыўную міжнародную дзейнасць ён быў у 1981 годзе ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

Самаахвярная шматгадовая праца М.Т.Раманоўскага была адзначаная высокімі ўзнагародамі Радзімы: акрамя вышэйназваных ордэнам Айчыннай вайны II ступені, 6 медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі і граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, граматамі Міністэрства вышэйшай адукацыі, рэктарата БДУ і інш. У 1974 годзе за вялікую шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць яму было нададзена званне "Заслужаны работнік вышэйшай школы".

Мікалай Тарасавіч Раманоўскі карыстаўся вялікім аўтарытэтам і павагай сярод калег і студэнцкай моладзі. Ён пакінуў па сабе добрую памяць як чалавек чуйны, добразычлівы, сціплы і ўважлівы да людзей. Светлая памяць пра яго заўжды застанецца ў сэрцах усіх, хто яго ведаў, жыў і працаваў разам з ім.



# ІНТАС: конкурс-96

Міжнародная асацыяцыя па спрыянню супрацоўніцтву з навукоўцамі новых незалежных краін былога Савецкага Саюза (ІНТАС) аб'явіла з 15 снежня 1996 года конкурс навукова-даследчых праектаў у галіне дакладных і прыродазнаўчых навук (фізіка, астраномія, матэматыка, тэлекамунікацыі, інфарматыка, хімія, біялогія, медыцына, навукі пра Зямлю, экалогія, энергетыка, аэранаўтыка, касмічныя даследаванні, механіка, інжынерныя навукі), а таксама грамадскіх, эканамічных і гуманітарных навук. Тэрмін прадстаўлення заяўкі — да 2 красавіка 1997 года.

Не прымаюцца праекты, якія з'яўляюцца працягам даследаванняў, што раней ужо фінансаваліся ІНТАС. Сумесная група даследчыкаў павінна ўключаць па меншай меры чатырох удзельнікаў праекта: двух — з адной ці болей краінаў СНД, двух — з розных дзяржаваў-членаў ІНТАС (у ІНТАС уваходзяць Аўстрыя, Бельгія, Нідэрланды, Данія, Фінляндыя, Францыя, Германія, Грэцыя, Ірландыя, Ізраіль, Італія, Люксембург, Нарвегія, Партугалія, Іспанія, Швецыя, Швейцарыя, Вялікабрытанія, а таксама ЕЭС). Каардынатарам, які нясе ўсю адказнасць за рэалізацыю сумеснага праекта, з'яўляецца кіраўнік адной з групаў з боку ІНТАС. Працягласць даследаванняў — ад 2 да 3 гадоў. Бюджэт конкурсу раўняецца 19 млн. ЭКЮ (прыблізна 25 млн. долараў ЗША). Памер аднаго гранта не перавышае 60 тысячаў ЭКЮ, прычым фінансаванне групы з ІНТАС складае не больш за 20 %.

Заяўка складаецца на англійскай мове. Яна ўключае 5 формаў, якія змяшчаюць: 1) агульную інфармацыю аб праекце і абавязкі каардынатара, 2) інфармацыю пра ўдзельнікаў праекта, 3) рабочую праграму, 4) рэзюме, 5) абавязкі кіраўнікоў групаў. Друкаваны і дыскетны варыянты заяўкі прадстаўляюцца ў ІНТАС каардынатарам.

Адбор праектаў праводзіцца па выніках незалежнай экспертызы, інфармацыя пра якую з'яўляецца канфідэнцыяльнай. Галоўныя крытэрыі адбору: навуковая значнасць, навізна ідэяў, узровень міжнароднага супрацоўніцтва, запрошваемы аб'ём фінансавання, эфектыўнасць кіравання праектам і рэальнасць яго выканання. Пры іншых роўных умовах перавага аддаецца праекту з удзелам маладых навукоўцаў і (ці) з удзелам выканаўцаў з розных краін былога Савецкага Саюза.

**Больш падрабязную інфармацыю пра конкурс і інфармацыю па афармленню заяўкі можна атрымаць у Беларускім рэспубліканскім фондзе фундаментальных даследаванняў, а таксама ў сістэме INTERNET (CORDIS: http: //www.cordis.lu/intas/home.html; INTAS: http: //www.ib.be/intas) ці па пісьмоваму запыту (пошта, факс, электронная пошта) непасрэдна ў ІНТАС (INTAS, 58 Avenue des Arts, box 8, B-1000 Brussels, Belgium; Fax: +32-2-549 01 56; e-mail: call96@intas.be).**

Прапануем папкі для дыпломных прац коштам 75 тысяч рублёў. Звяртацца на адрас: БДПА, корпус 3, пакой 8 (або 8а), тэл. 232-80-91.

## ДАІ паведамляе

Бадай, не варта тлумачыць, што нават найменшае парушэнне дарожнай дысцыпліны вядзе да непрадбачаных наступстваў.

Па звестках ДАІ, за 1996 год у Мінску адбылося 768 дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ). У іх загінула 107 чалавек, былі паранены 776. Па віне пешаходаў здарылася 383 ДТЗ, у якіх загінулі 43, былі паранены 139 чалавек.

За мінулы год толькі па Маскоўскаму раёну сталіцы да адміністратыўнай адказнасці за парушэнне Правілаў дарожнага руху былі прыцягнуты 71 400 чалавек, з іх пешаходаў было 27 409. У нецвярозым стане на дарозе былі затрыманы 727 чалавек.

Парушэнне дысцыпліны на дарогах уяўляе небяспеку не толькі для самога парушальніка, але і для іншых. Пазбягайце неабдуманых учынкаў, спыняйце тых, хто парушае Правілы дарожнага руху.

*А.КУДРАЎЦАЎ, дзяржаўтаінспектар Маскоўскага ДАІ*

## Студэнцкая сесія

*У час, калі студэнты нашага універсітэта (і не толькі) здаюць экзамены і залікі, карэспандэнт "Беларускага універсітэта" зазірнуў на геаграфічны факультэт. Прапануем Вашай увазе фотаздымкі, зробленыя ім падчас зімовай сесіі.*








# Шпаргалка для завочніка

*Чым адрозніваецца завочнік ад стандартнага студэнта? Ён распазнаецца ў час сутыкнення з выкладчыкамі ў вузкіх калідорах ВНУ. Стацыянаршчык (той, хто трывіяльна вучыцца на дзённым аддзяленні) адразу магутна раве нешта кшталту: "Добры дзень, Нікіфар Нікіфаравіч!", а завочнік задуменна і тужліва праходзіць міма. Бо за час кароткай падрыхтоўчай сесіі ён не паспявае запомніць усіх выкладчыкаў у твар. Ды яшчэ таму, што прапускае 90% лёкцыяў і асобных выкладчыкаў "адкрывае" для сябе ўжо на экзамене...*

Міф пра тое, што ўсе завочнікі — пагалоўна гультаі і абібокі, прыдумалі інфантыльныя стацыянаршчыкі і іх бацькі, якія ганарацца разумнымі дзецьмі. Завочнікі — самыя звычайныя студэнты, праўда, яны менш наведваюць лекцыі і, адпаведна, больш хвалююцца на экзаменах і заліках.

Таму, калі Вы паступілі на завочны факультэт (няма магчымасці і жадання адрывацца ад любімай работы, лянота выседжваць стацыянарныя лекцыі, не прайшлі па конкурсу на дзённае аддзяленне і г.д.), забудзьцеся на школьную тэхналогію навучання. На завочным факультэце любой ВНУ спрадвеку існуюць свае правілы і прафесійныя методыкі здачы экзаменаў, з якімі мы прапануем Вам азнаёміцца самым старанным чынам. Для скарачэння колькасці самастойна набітых гузакоў.

**Па-першае**, пастарайцеся завесці сабе (не, не марскую свінку!) як мага большую колькасць сяброў у групе і на плыні. Менавіта яны падсунуць Вам ратаваўчы канспект у хвіліну адчаю, выклічуць на экзамен, калі Вы захопіцеся праглядам перадачы "У свеце жывёлаў". Галоўнае — паклапаціцеся пра імідж апантанага любімай работай і закаханага ў прафесію студэнта. Такія ў асяроддзі завочнікаў карыстаюцца нязменнай любоўю аднагрупнікаў, якія працуюць не па спецыяльнасці. Яны з Вамі не толькі падручнікамі падзеляцца, але і шпаргалкі на лазерным прынтэры выведуць.

**Па-другое**, у час начыткі лекцыяў знайдзіце магчымасць пабываць хоць па аднаму разу на тых прадметах, па якіх Вам вось-вось належыць здаваць экзамены і залікі. Так Вы пазнаёміцеся з вонкавым выглядам выкладчыкаў і ўжо не будзеце наступаць ім на ногі ў тралейбусе, які вязе дэмакратычны натоўп у альма-матэр. Апрача таго, запомніце адзін-два любімыя выразы кожнага "патрэбнага" ў гэтым семестры выкладчыка — і, паклаўшы руку на залікоўку, як на Біблію, зможаце нязмушана ствараць ілюзію паспяховага наведвання Вамі ўсіх без выключэння лекцыяў. А выкладчыкі гэта вельмі любяць!..

**Па-трэцяе**, у час здачы экзаменаў і залікаў націскайце на велічыню і разнастайнасць вашых самастойных заняткаў. Не шкадуйце фразаў накшталт: "Я вырашыў(ла) вывучыць фрагмент Вашай лекцыі, які мяне найбольш зацікавіў, больш шырока", "У дадатковай літаратуры я выявіў(ла) процьму карысных звестак".

**Па-чацвёртае**, не прамінайце магчымасці распавесці выкладчыку пра складанасць і значнасць Вашай працы. Можна нібыта выпадкова выраніць на стол мудрагелістую візітоўку, пакінуць у залікоўцы ціснутае золатам запрашэнне на ўрадавы фуршэт ці раптам вынуць з кішэні радыётэлефон, які надрыўна зазваніў. Галоўнае — не перастарацца і пакінуць у выкладчыка пачуццё ўдзячнасці за нечаканае знаёмства з такім прафесійна карысным чалавекам, як Вы. Нават калі Вы працуеце вартаўніком у якім-небудзь парку культуры.

**Па-пятае**, не злоўжывайце расказамі пра завочныя сямейныя цяжкасці (капрызныя дзеці, супругі, якія вас пакінулі і г.д.). Большасць выкладчыкаў чамусьці пачынае перажываць і накіроўваць няшчасных "жанацікаў" на пераздачу са словамі: "Дык навошта патрэбна было паступаць у нашу ВНУ і займаць чужое месца?" Расчуліць расказамі пра немаўлятаў, якія перманентна плачуць, можна толькі абраных — такое даступна толькі тонкім псіхолагам. І калі ў Вас з псіхааналізам праблемы, лепей не рызыкаваць... Апрача таго, многія выкладчыцы чамусьці сураевеюць, калі студэнткі, маладыя і самадавольныя, апранаюцца лепей за іх. Таму пакіньце ўборы ад Валянціна для прыёмаў і паляванняў, а на сесію накіньце што-небудзь прасцейшае.

**Па-шостае**, не думайце, нібы сесія ў завочніка пачынаецца з прыходу паведамляльнага выкліку. Гэта забабоны. Зацюканыя метадысткі не заўжды рассылаюць паштоўкі своечасова, дый пошта, самі разумееце... Так што чаканая вестачка можа прыйсці да Вас якраз праз два тыдні пасля заканчэння сесіі. Цікаўцеся тэрмінамі будучых экзаменаў падчас здачы папярэдніх і абмалёўвайце знамянальныя даты ў календары тлустым чырвоным алоўкам (можа, хоць бацькі ў час спахопяцца).

**Па-сёмае**, знайдзіце прыяцеляў і знаёмых на старэйшых курсах. Куфаль піва ва універсітэцкім буфеце, выпіты з больш дасведчаным таварышам, выльецца Вам не толькі ў карысныя звесткі пра спецыфіку здачы экзаменаў у таго ці іншага выкладчыка, але і, калі правільна падысці да вырашэння пытання, своечасова адгукнецца ў выглядзе рэферата ці нават курсавой працы.

**Па-восьмае**, пастарайцеся здаваць усё своечасова. У калектыве, не сапсаваным прыкметамі інтэлекту, нават Вашыя ўрыўкавыя веды будуць здавацца выкладчыкам вартымі цвёрдай чацвёркі, а то, глядзіш, і пяцёрачкі. Тэт-а-тэт у "міжсезонне" з тым жа самым выкладчыкам даказаць, што ў вольны ад працы час Вы прачыталі ўсе 356 рэкамендаваных кніг, будзе значна цяжэй...

Дый навошта Вам "хвасты", усё ж такі Вы не малпа. "Хвасты" непрыемныя самі па сабе як факт, ды яшчэ і пагражаюць гнюснымі метадысткамі, якія палохаюць бацькоў "папераджальнымі" паштоўкамі з ВНУ, дарагімі зімнімі кветкамі для выкладчыкаў і дадатковым галаўным болем.

Таму лепей вучыцеся разам з вясёлым калектывам, які штодзённа адзначае здачу чаго-небудзь. І хаця б перыядычна, у перапынках паміж афіцыйнымі сесіямі, прачытвайце што-небудзь па спецыяльнасці. Каб не ганіць слаўную армію завочнікаў і не пытацца шэптам на экзамене ў аднагрупнікаў, якія галоўныя дзейныя асобы ў "Майстры і Маргарыце". Як гэта часам робяць нядбайныя завочнікі-філолагі...

***Вольга КАСЦЕНКА***

## Слова замежнаму студэнту

*Рэдакцыя "Беларускага універсітэта" працягвае друкаваць матэрыялы кітайскіх студэнтаў, якія выказалі жаданне на час праходжання практыкі супрацоўнічаць з нашай газетай. Мы спадзяемся, што нашы чытачы не будуць занадта суровымі да першакурснікаў, якія яшчэ не дужа добра валодаюць мовай і не надта спрактываныя ў журналісцкім рамястве.*

### Мой родны горад Цзяоцзэо

Мой горад знаходзіцца на паўночным захадзе краіны ў правінцыі Хэ Нань. У ім жыве каля чатырох мільёнаў чалавек.

Цзяоцзэо мае шмат маляўнічых гістарычных месцаў. З некаторымі з іх звязваюцца прыгожыя легенды. Напрыклад, герой адной з іх, Юйгун, перасунуў горы; другі герой, Юньуа, рамантаваў суткі і г.д.

Каля горада знаходзіцца гара Тэ Ханье, на якой можна пабачыць вадапад Юн Тэа, што мае вышыню 310 метраў.

Наваколле майго роднага горада мае багатыя нетры: вугаль, нафту, мармур і г.д. Акрамя гэтага Цзяоцзэо з'яўляецца адным з галоўных сельскагаспадарчых высокаўраджайных раёнаў, дзе вырошчваюць кукурузу, пшаніцу, бавоўну і інш. Праводзяцца мерапрыемствы па аздараўленню эканомікі, пашыраюцца сувязі з замежжам.

### Навучанне ў Кітаі

Калі Вы жадаеце вучыцца ў Кітаі, Вам неабходна ведаць кітайскую адукацыйную сістэму. Напрыклад, сярэдняя адукацыя ў Кітаі абавязковая і яе атрымліваюць за дзевяць гадоў. Вышэйшую адукацыю ў інстытуце атрымліваюць за 2-3 гады, а ва універсітэце — за 4-5 гадоў. За выдатную паспяховасць на экзаменах студэнтам выдаюць грашовыя прэміі. Стыпендыі выдаюцца толькі незаможным студэнтам.

*Ван Цын Фэн, Ван Чжэ,*
*студэнты I курса факультэта журналістыкі БДУ*



### Я ўпершыню ўбачыў снег

Я — студэнт, прыехаў на вучобу з Кітая. Жыву не ў інтэрнаце, як мае сябры, а на кватэры ў прыватным доме. Гаспадыню кватэры завуць Людміла, а яе сына — Сяргей. Яна працуе настаўніцай у школе, а яе сын вучыцца ў шостым класе.

Пасля заняткаў я еду з факультэта на тралейбусе. Кожны дзень займаюся з Сяргеем рускай мовай. Мой сябра расказвае мне пра Мінск, пра жыццё ў Беларусі. Увогуле мае беларускія сябры вельмі добра ставяцца да мяне. Да астатніх кітайскіх студэнтаў таксама. Таму выказваю ім вялікую ўдзячнасць.

Але больш за ўсё мяне ўражвае зіма. На кватэры, дзе я жыву, цёпла, і я нядаўна выйшаў на вуліцу без паліто. Хоць мне і вельмі падабаецца беларуская зіма, але я не магу знаходзіцца доўгі час на такім холадзе. На маёй радзіме ніколі не бывае марозу. Зараз у Беларусі вельмі сцюдзёна і шмат снегу. Я ўпершыню ўбачыў снег і не ведаў, што ёсць такая прыгажосць.

*Гао Чжэн Дун,*
*студэнт I курса, факультэта журналістыкі*

# М А Й С Т Р О Ў Н Я



*Гэтая публікацыя — паэтычны дэбют Уладзіміра СМАЛЯКА, студэнта 4 курса філфака. Для Уладзіміра характэрна абстрактнасць, калі не сказаць абсурднасць, мыслення. Гэта зайздросная якасць яго паэтычнай натуры. Вось чаму многае ў яговых вершах наўмысна завастраецца, многае набывае відавочную няправільнасць, алагічнасць, парадаксальнасць гучання. А гэта, у сваю чаргу, вымагае пошуку сэнсаў праз шырокае кола асацыяцый, дае шырокі простор для ўласна чытацкай фантазіі.*

*Прабачым маладому паэту (Уладзіміру — усяго 20 гадоў) за некаторыя моўныя і стылістычныя шурпатасці, якія можна "спісаць" за кошт "сімптомаў росту", і пажадаем яму новых паэтычных знаходак і адкрыццяў.*

*У добры час!*

*Валерый МАКСІМОВІЧ, дацэнт кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя БДУ*

Все, что я тебе пел,
Скоро станет неправдой и будет забыто.
Я сорвал свой голос,
Объясняя тебе, что эти двери закрыты.

Но мы сумели выйти за грани тепла
И подняться повыше "картины"...
Неизвестность манила тебя, а меня
Обратность за собой уводила.

И я был рад, что ты уходишь одна
И забыла со мной попрощаться.
Мой взгляд тебя трижды в закате словил,
И тогда я пошел собираться.

Я оставил за стенами все, присущее
человеку,
И поплыл по земле, пытаясь солнце
догнать.
И за время движенья ни разу не
захотелось
Присесть, закурить и кого-то подождать.

● ● ●

Вот порог, за которым начинается путь,
предназначенный мне,
А на нём стоит мой Бог с полосами
от плетней на спине.
И с обратной стороны одинокой звезды
мерно падает дождь,
Вызывая в душе ощущения, как на волне.

А на фоне восходящего солнца возникает
прилив,
И волна души с приливом создают
непонятный мотив.
Плавный звук уходящих следов замывает
вода,
Силуэт наших снов приближается, все
охватив.

А тропа за спиной утопает в хрустальной
траве,
Виден пламенный взор на далеком
красивом холме.
Я дошел, улыбаюсь, я счастлив тому,
что ты спишь,
Отражая звезду и плеск волн в молодой
тишине.

● ● ●

Потерялось моё биополе.
Без него мне теперь не судьба.
И, быть может, теперь моя доля —
Удаляясь, смотреть на тебя.

Мне б подняться теперь на вершину
И открыть бы пошире глаза.
Но — увы!— не нашлось причины,
Хоть на небе бушует гроза.

И я вытряхну пыль из кармана
И корону надвину на лоб.
Никакого здесь нету обмана —
Я направлюсь на спиленный столб.

Мой товарищ с крылом на затылке
Мне предложит свой мускул и свет.
Он лишь только дух из бутылки —
Никакого обмана здесь нет.

И в царстве с кругами рассчета
Мы останемся жизнь доживать,
А за нами, быть может, кто-то
Продолжает следы заметать.

● ● ●

Звезда над костром — отражение сна,
Ты завтра проснешься, а рядом — весна.
И ты ощутишь, что природа тесна,
Во взмахе своей руки.

Странные птицы летят над тобой.
Но ты их найдешь за глубокой горой.
Ведь помнишь: бывали там мы порой
В дождь вертикальных ветвей...

...Лес расступился — и просит войти.
Он знает, что э т о нам нужно пройти.
Ты сделала шаг, и я крикнул: "Лети!"—
А сам превратился в туман.

Я знаю, что дальше пойдешь ты одна,
Сам же останусь испить все до дна.
Но ты возвращайся за мною всегда —
Я твой вечный стук изнутри.

Знаю, что ты очень любишь весну.
И я вместе с нею тебя навещу —
В виде запаха трав и весны прилечу.
Ты вздыхай, ты вздыхай, ты вздыхай!..

*Прапануем увазе чытачоў вершы студэнта нашага ўніверсітэта, які вырашыў падпісаць іх псеўданімам* Fra Niat.

Л.Т.

Вечер июньский повесил завесу
Из девичьих платьиц, прекрасных,
как сон,—
В цветных пиджаках молодые повесы
Не могут сдержать восхищения стон.

Сегодня для них лишь играют
оркестры,
Светит луна, и в рассвет соловьи
Поют свои старые новые тексты:
Тексты надежды и тексты любви.

Белые платья мелькают, как ветер,
Бал на прощание свечи зажег,
А где-то в робко мерцающем свете
С любовной строкой обронен был
листок.

Музыка тешится стенами зала,
В небе струится прозрачная синь.
Сегодняшней ночью гитара не спала,
Сегодняшний вечер — час для
богинь...

## У суседзяў

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

# Забавы "Легіёна"

### Дзейныя асобы:

***Герман Панчанкаў*** — самы галоўны... Любіць спазняцца, "штурхаць прамову" і гуляць па сумётах і кустах разам са сваім сабакам Марго.

***Міхаіл Свістуноў*** — малады чалавек, які не спрыяе жартам. Але дзеля сваёй бяспекі не старайцеся мець з ім справы зранку: магчыма, Вам выратуе жыццё толькі тое, што Вы будзеце знаходзіцца на другім канцы тэлефоннага дроту.

***Вадзім Гапіенка*** па неафіцыйных звестках лічыцца самым сімпатычным "легіянерам". Але на ягоныя падколкі і шпількі лепей не нарывацца. Захапляецца картачнымі фокусамі і відэакасетамі.

***Віталь Зубок*** — самы высокі, самы гучны, самы прабіўны. Настаўнік па прэферансу, якога чакае слава Сухамлінскага. Хобі — чытанне запісак і раскачванне на крэслах (пераламаў усе).

***Дзмітрый Чэх*** — самы ціхі "легіянер". Можа ўвесь вечар прасядзець у клубе, забіўшыся ў кутоок, і толькі стомлена пагглядаць на ўсіх.

***Дзяніс Шапёлкін***... Што б рабіў "Легіён" без яго? Любімы выраз — "ква-ква". За што і быў празваны некаторымі дзяўчатамі Царэўнай-жабкай.

Новы год ужо прамінуў, ідзе сесія. Але за грудай канспектаў і кніг студэнт БДУ можа адкапаць пераднавагодні нумар "Беларускага універсітэта", які накіраваўся ў госці да сваіх старых знаёмых у БДПА.

Калі іду ў госці да сяброў-"легіянераў", імкнуся паявіцца каля пакойчыка крыху раней за яго гаспадароў. Дзверы заўжды ледзь стаяць пад тонай запісак — так хлопцы звязваюцца з навакольным светам, калі разбягаюцца на "пары", ці навакольны свет звязваецца з імі, калі яны затрымаюцца ў Шапёлкіна дома.

Сёння "легіёнаўскія" дзверы ўпрыгожаныя двума творамі Вадзімкі: "Шапёлкін, калі ты не прынясеш ключ, я табе зраблю аперацыю без наркозу", і крыху ніжэй — "Шапёлкін, ты нядобры чалавек".

— О, прывітанне,— невядома адкуль узяўся за маёй спіной Герман. — Ты даўно тут?

— Толькі падыйшла. Што гэта значыць?— кіўком паказала на запіскі.

— Дзяніска сышоў у падполле з нашым адзіным ключом. Вось Вадзька і нервавацца,— усміхнуўся Герман, выцягнуўшы з кішэні сродак для адкрывання замкоў.

За два тыдні, што я начавала і днявала на журфаку, у гэтым пакойчыку нічога не змянілася. На прываконні красуюць усё тыя ж засохлыя васількі і ўсё таксама ж ляжаць калоды картаў. Левая сценка заклееная ўсё тымі ж геаграфічнамі картамі, а правая — партрэтамі Ельцына і іншых славутасцей. Вось толькі колькасць цэлых крэслаў змяншаецца у геаметрычнай прагрэсіі.

— Як тут душна,— уздыхнуў Герман, шмыгнуўшы да вакна. Раптам ён са злосцю закрычаў:

— Я ж прасіў не закрываць вакно на верхнюю зашчапку.

— Ну і што?— не адразу зразумела я.

— Паспрабуй цяпер дастань.

Мяне раптам азарыла. Віталь пры сваім росце закрываў вакно толькі на верхнюю зашчапку, што заўжды выводзіла з сябе параўнаўча невысокага Германа.

— Германчык, не кіпяціся,— паспрабавала я астудзіць хлопца. — Табе складана дацягвацца, а Віталіку — цяжка нахіляцца.

Паціху пачалі падцягвацца "легіянеры". І тут пачалося...

— Чуеш, Вадзька,— пакрыўджана-салодкім голасам пачаў Дзяніска,— ты вось учора сышоў з вечарынкі, а мне давялося тую дзяўчыну праводзіць. Мала таго, што мы большую частку дарогі пратопалі, дык яна зацягнула мяне на сваю лесвічную пляцоўку, дзе мы яшчэ хвілінаў 15 размаўлялі. Але самае страшнае, што потым выйшла яе мама, з твару падобная да Германа...

Пры апошнім імю ўсе не змаглі стрымаць смеху. Затое Герман з выглядам знаўцы зазначыў:

— Вельмі нават сімпатычная мама.

Нібыта вяртаючыся да ранейшай размовы, я паспрабавала даведацца пра некаторыя "легіёнаўскія" таямніцы:

— Віталік, тут Дзяніс расказваў пра свае ўчорашнія пахаджэнні, а я чула, што ў цябе неяк добра пагулялі.

— Неяк сабраліся прагуляць ноч у Віталіка,— не прамінуў магчымасці пафіласофстваваць Герман.— Вырашылі, што кожны возьме з дому штонебудзь паесці. Я прыходжу дадому — на мяне бацькі накрычалі, што некуды збіраюся так позна. Я — за тапачкі і бегма за дзверы. Так і прыйшоў: усе з чым-небудзь, а я з тапачкамі.

— Ты лепей прыгадай, як потым замінаў усім спаць,— уставіў слова Вадзім.

— Дык ніхто ж спаць і не збіраўся,— зрабіў нявінны выгляд Герман.

— Як жа, ты дасі,— па тону Вадзімкі можна было здагадацца, што яму дасталося больш за усіх.— Усе, як нармальныя людзі, пачалі засынаць. А Герман, расцягнуўшыся на часопісным століку, нібы выпадкова зваліўся на Мішку, а потым шлёпаўся і на астатніх.

— Але гэтага яму здалося мала, і ён пабег у суседні пакой мяняцца з народам лыжкамі,— дабіў капітана Мішка.

— Хадзілі чуткі, што вы нешта ладзілі і на Мішкаў дзень нараджэння,— працягвала распытваць я.

— Мы проста гулялі ў дроцікі,— нарэшце трапіў у цэнтр увагі Шапёлкін,— на Віталіка, які прайграў, надзелі спадніцу і прымусілі бегаць вакол стала.

— Гады!— пакрыўдзіўся Віталік.

— Падзякуй, што мы цябе ў калідор не выгналі,— адпарыраваў Дзяніс.

— Але больш за ўсё дасталося Мішку,— паспрабаваў узняць свой аўтарытэт Віталька.— Мы гэтую спадніцу запхалі ў яго мяшок і прымусілі выкінуць сярод праспекта.

— Магу ўявіць, што было,— пахітала я галавой.

*У гэты момант ледзь чутна ўздыхнуў у сваім кутку Дзіма, і я вырашыла спыніць свой рэпартаж-апавяданне з картачнага клуба "Легіён", каб не раскрываць усе іх сакрэты.*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - рэктарат БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

*Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.*

*Газета падпісана ў друк у 12.00.*

*23 СТУДЗЕНЯ*
*Зак. 1785.*
*Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.*

В.а. рэдактара
Т.М. КАЗАК